# Не старэе душой ветэран

Слаўны баявы шлях дарогамі Вялікай Айчыннай вайны прайшоў жыхар Хоцімска Міхаіл Бондараў.

- Прызвалі мяне на абавязковую ваенную службу 5 лістапада 1943 года, - расказвае ветэран, - калі наш Клімавіцкі раён, адкуль я родам, быў вызвалены савецкімі войскамі ад нямецка-фашысцкіх акупантаў. Трапіў у састаў першага вучэбнага стралковага палка, што базіраваўся ў Марыйскай АССР. Стаў курсантам школы малодшых камандзіраў. Тут абучаўся стралковай і гарматнай справе.

Пасля заканчэння вучобы Бондараву прысвойваецца званне малодшага сяржанта, яго прызначаюць камандзірам разліку гарматы. І ў саставе 217-га асобнага знішчальнага супрацьтанкавага палка адпраўляецца Міхаіл Маісеевіч на фронт.

Войскі ІІІ-га Беларускага фронту, дзе ён праходзіў ваенную службу, грамілі ворага ва Усходняй Прусіі. Іх першаступеннай задачай з'яўлялася як мага хутчэй узяць умацаваную фашысцкую цытадэль - Кёнігсберг. Гітлераўцы ярасна супраціўляліся. Баі былі жорсткія. Не раз фашысты пераходзілі ў контратакі. Аднак супрацьтанкавая артылерыя заўжды адбівала іх. Нашы байцы працягвалі цясніць ворага.

Ужо да Кёнінгсберга было, як кажуць, рукой падаць, калі раптам Бондарава параніла. Асколкі снарада трапілі ў нагу і бядро. Артылерыста адпраўляюць у шпіталь № 572. І пацягнуліся дні лячэння...

Зноў на перадавую пасля выздараўлення трапляе ў 18-ы артылерыйскі батальён камандзірам разліку гарматы. Гэтаму ваеннаму падраздзяленню прысвайваецца ганаровае званне гвардзейскага. Міхаіл Маісеевіч з красавіка па ліпень 1945-га года служыць на данай пасадзе. Яму прысвайваецца званне гвардыі сяржанта. За ўдзел у баях на тэрыторыі Германіі ўзнагароджваецца медалём "За адвагу".

- Пасля перамогі над фашыстамі, - успамінае мой субяседнік, – вайна для мяне не закончылася. Летам нас пагрузілі ў эшалон і накіравалі ў Манголію. Там былі чатыры месяцы. А затым цераз Манчжурыю, Хінганскія горы мы рушылі да Квантунскага паўвострава. І неўзабаве сустрэліся з новым ворагам – японскімі самураямі. Іх таксама білі бязлітасна, як і фрыцаў, не шкадавалі снарадаў, раз яны ўзнялі зброю супраць нашай Айчыны.

У адным з баёў разлік артылерыста Бондарава трапнымі ўдарамі



выбіў японцаў з умацавання. Вораг уцякаў з усіх ног. Ды яго насцігалі нашы снарады. Подзвіг Міхаіла Маісеевіча быў ацэнены па заслугах: ён удастайваецца ордэна Славы трэцяй ступені. Вайна з японцамі працягвалася нядоўга, але дадому салдат вярнуўся ўсё роўна не хутка: яго часць затрымалася ў Кітаі.

У свой калгас "Герой працы" на Клімаўшчыне прыйшоў працаваць у канцы саракавых гадоў. Быў у паляводстве, затым брыгадзірам. У Шклове скончыў курсы сепаратаршчыкаў малака. І з гэтай пары яго працоўнае жыццё звязваецца з малочнай прамысловасцю.

Спярша Міхаіл Маісеевіч быў прызначаны загадчыкам сепаратарнага пункта ў Звянчатцы, пасля ў Галічах ад Клімавіцкага малочнага завода. Закончыў Слуцкую спецыяльную школу майстроў-сыраробаў. Прызначаецца майстрам Чэрыкаўскага сырнага цэха. А ў 1964 годзе згодна з загадам Крычаўскага малакакамбіната прызначаецца галоўным майстрам-сыраробам Хоцімскага малочнага завода.

Разам з сям'ёй – жонкай Марыяй Андрэеўнай і дзецьмі сынам Мікалаем і дачкой Валянцінай – пераехаў у Хоцімск на пастаяннае месца жыхарства. Спярша кватэравалі. А потым купілі дом на вуліцы імя Болдзіна.

Сыры, якія выраблялі Бондараў і яго брыгада, карысталіся ў пакупнікаў вялікім попытам. Смачныя, духмяныя, яны прыцягвалі пакупнікоў. Ды і цэны на іх былі даступныя.

- Свае сыры мы, нават, у Маскве прадавалі, - усміхаецца Міхаіл Маісеевіч. – Наогул, беларускія сыры ў той час карысталіся вялікім попытам. Асаблівых сакрэтаў прыгатавання іх у нас не было. Але прыпаднесці, упрыгожыць галоўкі сыроў мы ўмелі. І ўсё гэта выраблялі з малака.

Менавіта за гэта М.М. Бондараў неаднаразова заахвочваўся. Імя яго не сыходзіла з Дошкі пашаны завода. І зараз у сямейным архіве захоўваюцца Ганаровыя граматы Хоцімскага райкома КПБ і райвыканкама, Міністэрства перапрацоўваючай прамысловасці Беларусі. Цяпер ён на заслужаным адпачынку. Жыве ў сваім доме з дачкой Валянцінай, якая доўгі час працавала аператарам машыннага даення кароў у калгасе "ІІІ Інтэрнацыянал". Сустракаецца з ветэранамі вайны І.У. Старых, І.С. Федарковым, І.М. Старасвецкім. І тады ўспамінаюць ветэраны дні і тыя мясціны, дзе ваявалі.

Прыемна, што былога артылерыста, гвардзейца не забываюць. Кожны год яму прысылаюць віншаванні раённы савет ветэранаў вайны і працы, Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнка. А летась дамоў да ветэрана зайшлі райваенком, падпалкоўнік Андрэй Каралёў з фатографам. І Міхаілу Маісеевічу быў уручаны юбілейны медаль у азнаменаванне 65-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і каляровае фота.

Калі мы гутарылі, у дом яго завіталі вучні СШ №2. Пытаюцца: "Чым дапамагчы Вам, паважаны Міхаіл Маісеевіч?" Расчуліўся душой ветэран, шчыра падзякаваў юных дабраахвотных памочнікаў...

Годы ідуць. Ды не старэе душой ветэран вайны і працы. Нягледзячы на тое, што неўзабаве споўніцца 84 гады, Міхаіл Маісеевіч, як кажуць, яшчэ з цвярозым розумам, шмат памятае. Жыццё ведае не па чутках з яго радасцямі і нягодамі. І няхай прыемнага і ў жыцці, і ва ўспамінах у яго будзе значна больш.

**Іван ЦІТОЎ.**

**Цітоў, І. Не старэе душой ветэран** : [пра Бондарава М.М., ветэрана Вялікай Айчыннай вайны] / Іван Цітоў // Шлях Кастрычніка. — 2010. — 8 мая. — С. 2.